*Республиканский постоянно действующий семинар для авторов учебников и учебных пособий, членов экспертного сообщества*

# Забеспячэнне пераемнасці падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»

***Валочка Ганна Міхайлаўна*,**
**галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Акадэміі адукацыі**

28 апреля 2026 года

# Прынцып пераемнасці

заключаецца ў «паслядоўнасці, сістэматычнасці размяшчэння матэрыялу, у апоры на вывучанае і на дасягнуты вучнямі ўзровень моўнага развіцця, у перспектыўнасці вывучэння матэрыялу, ва ўзгодненасці ступеней і этапаў… работы».
(Словарь-справочник по методике преподавания русского языка)

*Правільна арганізаванае і сістэматычнае паўтарэнне раней вывучанага служыць асновай для атрымання новых ведаў і забяспечвае трывалае і свядомае засваенне асноў навукі.*

# V клас

**I. Раздзел «Паўтарэнне вывучанага ў I–IV класах» (11 гадзін)**

**II. Рубрыка «Успамінаем і паўтараем»**

# Паўтарэнне

**Успамінаем і паўтараем**

**132.** Прачытайце тэкст. Раскрыццю якой думкі ён падпарадкаваны? У якім сказе яна сфармулявана?

Растлумачце правапіс слоў з выдзеленымі літарамі.

**Успамінаем і паўтараем**

**115.** Прачытайце словы. Які гук вымаўляецца пасля выдзеленых літар?

| | |
|---|---|
| павільён | пад'ём |
| Ільіч | аб'ява |
| льюцца | п'юць |

Пасля якіх зычных — цвёрдых ці мяккіх — пішацца раздзяляльны мяккі знак? Апостраф?

Якія гукі абазначаюць літары *е, ё, ю, я, і* пасля раздзяляльнага мяккага знака і апострафа?

# Паўтарэнне

**Успамінаем і паўтараем**

**39.** Вусна прадоўжыце сказы.

1. Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па ... . 2. Склад з адной літары нельга ... . 3. Пры пераносе слоў літары ... не аддзяляюцца ад папярэдняй літары. 4. Пры пераносе слоў не раздзяляюцца спалучэнні літар ... .

**Успамінаем і паўтараем**

**45.** Вусна адкажыце на пытанні.

Колькі галосных гукаў у беларускай мове? Назавіце іх. Чаму яны атрымалі такую назву?

**Успамінаем і паўтараем**

**52.** Сфармулюйце правіла напісання галосных *о, э, а*, вусна запоўніўшы пропускі ў тэксце.

Літары ... звычайна пішуцца пад націскам. Гукі [о], [э] не пад націскам пераходзяць у гук [..]. Тады замест літар *о, э* пішацца ... .

Праілюструйце правіла прыкладамі з тэксту «Белка і Зорка».

# Паўтарэнне

**Успамінаем і паўтараем**

**63.** Устанавіце адпаведнасць паміж пунктамі правіла «Правапіс літар *е, ё, я*» і прыкладамі напісанняў.

| | |
|---|---|
| 1. У беларускай мове літара *ё* пішацца пад націскам. | а) белы — бялі́ць, лёд — лядо́вы |
| 2. У першым складзе перад націскам замест *е, ё* пішацца літара *я*. | б) цёплы, пялёстак |
| 3. У іншых ненаціскных складах *е* захоўваецца. | в) белава́ты, ледаві́к, во́сень |

Дапоўніце правіла прыкладамі з тэксту папярэдняга практыкавання.

# Паўтарэнне

**Успамінаем і паўтараем**

**171.** Складзіце і запішыце словазлучэнні. Вызначце ў кожным словазлучэнні галоўнае слова. Падкрэсліце словы, якія паказваюць адметнасць беларускай мовы.

Мова (я к а я?) ...; мары (я к і я?) ...; песні (я к і я?) ...; сны (я к і я?) ...; слова (ч ы ё?) ...; колер (я к і?) ...; смак (ч а г о?) ...; пах (я к і?) ...; верш (п р а ш т о?) ... .

Растлумачце сэнс слова *самабытная**. Якія словы ў ім «схаваліся»?

**Успамінаем і паўтараем**

**194.** Якія з прыведзеных слоў з'яўляюцца антонімамі? Якое слова лішняе ў кожным радзе? Запішыце антанімічныя пары.

1. Блізкі, далёкі, добры. 2. Радасць, сум, адзінота. 3. Выліць, наліць, даліць. 4. Адважны, баязлівы, страшны. 5. Актыўнасць, бадзёрасць, пасіўнасць. 6. Горача, светла, холадна.

Знайдзіце словы, у якіх свісцячыя зычныя перад мяккімі зычнымі вымаўляюцца мякка.

# Прынцып пераемнасці

## *Ключавыя механізмы пераемнасці:*

- **Зместавы аспект:** падручнікі 5 класа павінны абапірацца на паняцці, сфарміраваныя ў 1-4 класах, забяспечваючы развіццё, а не простае паўтарэнне матэрыялу.
- ***Метадычны аспект:*** захаванне сістэмы практыкаванняў, метадаў навучання мове (практычных, тэарэтычных, тэарэтыка-практычных) пры паступовым іх ускладненні.

# Зместавы аспект

Арфаграфічныя правілы, што вывучаюцца на розных ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, падзяляюцца на дзве групы:

- 1) правілы, якія складаюць змест навучання арфаграфіі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
- 2) правілы, вывучэнне якіх прадугледжана на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі і якія не разглядаюцца ў пачатковай школе.

У межах першай групы арфаграфічных правіл можна вылучыць дзве падгрупы:

- а) правілы, зместавую сутнасць якіх вучні цалкам засвойваюць на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;
- б) правілы, зместавае «ядро» якіх вывучаецца ў пачатковай школе, а на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца іх прырашчэнне.

# Зместавы аспект

Правілы, якія вучні цалкам засвойваюць у пачатковай школе:

- абазначэння мяккасці зычных на пісьме з дапамогай літар *і*, *е*, *ё*, *ю*, *я* і мяккага знака;
- правапіс галосных пасля зацвярдзелых зычных;
- правапіс раздзяляльнага мяккага знака.

# Зместавы аспект

| 2 клас | 5 клас |
| --- | --- |
| **Тэма «Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі»** | Тэма «Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя, іх вымаўленне і правапіс» |
| Зацвярдзелыя зычныя гукі [р], [ж], [ш], [ч], [дж], [ц] не маюць парных мяккіх. Пасля літар, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі, пішуцца а, о, у, ы, э: шафа, жолуд, рука, цыбуля, пячэ,джэм. | Не маюць пар зацвярдзелыя зычныя [ж], [ш], [дж], [ч], [р], [ц], цвёрды гук [ў] і мяккі [й]. Пасля зацвярдзелых зычных пішуцца літары а, о, у, ы, э: рака, жолуд, пажурыць, цыркуль, шэлест. |

# Зместавы аспект

| 2 клас | 5 клас |
|---|---|
| **Тэма «Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме»** | Тэма «Глухія, звонкія ***і санорныя*** зычныя. Іх вымаўленне і правапіс» |
| **Для праверкі слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі на канцы і ў сярэдзіне слова трэба змяніць слова так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук: сцежка – сцежачка, кашка – каша.** | У беларускай мове нямала слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі, напісанне якіх патрабуе асаблівай увагі. У такіх выпадках на дапамогу заўсёды гатовы прыйсці праверачныя словы з галоснымі ці санорнымі зычнымі, перад якімі любы невыразны гук вымаўляецца выразна, і адразу становіцца зразумелым, які літарай патрэбна перадаць яго на пісьме: кні..ка (ж ці ш?) – кніжачка, кніжны – кніжка; про..ьба (з ці с?) – прасіць – просьба. |

# Зместавы аспект

| 2 клас | 5 клас |
|---|---|
| Тэма «Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме» | Тэма «Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс» |
| **Падоўжанае вымаўленне гукаў на пісьме передаецца дзвюма літарамі: Палессе, збожжа, зацішша.**<br>**Падоўжаны гук [дз’] на пісьме абазначаецца спалучэннем літар ддз: разводдзе, ладдзя.** | Фанетычнае падаўжэнне гукаў на пісьме перадаецца дзвюма літарамі: падарожжа, раздолле, узвышша, Наталля, Таццяна, Усціння і інш.; *але: Ілья, Касьян, Ульяна, Юльян і вытворныя ад іх: Ільін, Касьянаў, Емяльянаў, Ульянаў і інш.*<br>Падоўжаны гук [дз’] на пісьме перадаецца спалучэннем літар ддз: меддзю, разводдзе, стагоддзе.<br>*У запазычаных словах зычныя гукі не падаўжаюцца: алея, калона, каса, Эла, Эма.*<br>***Выключэнне:*** *ванна, мадонна, манна, панна, саванна, Жанна, Ганна, Сюзанна.* |

# Зместавы аспект

| 2 клас | 5 клас |
|---|---|
| Тэмы «Зычныя гукі [д] — [дз’]»<br>Зычныя гукі [т] — [ц’] | Тэма «Зычныя [д] — [дз’], [т] — [ц’], іх вымаўленне і правапіс» |
| Гук [д] цвёрды. На пісьме ён абазначаецца літарай д. Пасля літары д пішуцца а, о, у, э, ы: дом, дым.<br>Гук [дз’] мяккі. На пісьме ён абазначаецца спалучэннем літар дз. Пасля дз пішуцца е, ё, ю, я, і, ь: дзень, дзяўчынка.<br>Гук [т] цвёрды. На пісьме ён абазначаецца літарай т. Пасля літары т пішуцца а, о, у, э, ы: хата, каты´. Гук [ц’] мяккі. На пісьме ён абазначаецца літарай ц. Пасля літары ц, якая абазначае мяккі зычны гук, пішуцца е, ё, ю, я, і, ь: у хаце, коцік. | Дз і ц пішуцца: перад літарамі е, ё, ю, я, і, а таксама перад мяккім знакам: у паходзе, глядзім, медзь, цёплы, сцюжа, пяць; □ перад літарай в, калі яна абазначае мяккі гук [в’]: дзверы, цвёрды, чацвер. *Літары д у складзе прыстаўкі і т у складзе суфікса перад [в’] захоўваюцца: адвязаць, падвезці, у грамадстве, у бітве.*<br>*У большасці іншамоўных слоў у адпаведнасці з вымаўленнем пішуцца д і т: радыё, дыск, аптэка, фестываль. У некаторых іншамоўных словах у адпаведнасці з традыцыяй і літаратурным вымаўленнем пішуцца дз, ц: цір, цюльпан, касцюм, дзюдо. Перад суфіксамі ін, ір, ік, ёр, еец, ейск пішуцца дз і ц: бландзін, камандзір, рулецік, шахцёр, індзеец, гвардзейскі.* |

# Метадычны аспект

| II клас | V клас |
| --- | --- |
| 1. Спішыце. Падкрэсліце дз разам з наступнай літарай.<br>2. Назавіце/Выпішыце словы з гукамі [д] і [дз’].<br>3. Спішыце. Устаўце патрэбныя літары.<br>4. Спішыце, устаўце д або дз. Падкрэсліце дз разам з наступнай літарай<br>5. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Для гэтага перакладзіце рускія словы на беларускую мову.<br>6. Прачытайце. Змяніце словы ў дужках так, як патрабуе сэнс. Цыбуля расце на (агарод). Грушы растуць у (сад). Запішыце адзін сказ на выбар. Назавіце слова з гукам [дз’]. | 1. Спішыце словы, выбіраючы з дужак патрэбную літару або спалучэнне літар. Падкрэсліце ўсе арфаграмы ў слове мядзведзь.<br>2. Запішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне літар д, дз у словах.<br>3. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. У якім сказе сфармулявана асноўная думка тэксту? Вусна пракаменціруйце правапіс слоў з літарамі (спалучэннямі літар) д, дз, т, ц.<br>4. Праслухайце сказы/тэкст. Выпішыце словы з літарай дз.<br>5. Перакладзіце (вусна) тэкст на беларускую мову. Растлумачце напісанне слоў з д (дз), т (ц) у беларускай і рускай мовах.<br>6. Прачытайце верш… Да выдзеленых слоў падбярыце і запішыце аднакаранёвыя словы або формы слова, каб чаргаваліся гукі [д] — [дз ’], [т] — [ц’]. |

# Прынцып пераемнасці

«Пры распаўсюджванні навучання за межы пачатковых класаў не выдзяляюцца… асаблівасці і спецыфіка наступнай ступені… У любой дыдактыцы і методыцы можна знайсці палажэнне аб тым, што ў сярэдніх класах “ускладняецца змест”, “павялічваецца аб’ём” ведаў… Аднак тут не разбіраюцца падрабязна ўнутраныя змены “зместу і формы” навучання. Гэтыя змены апісваюцца толькі як колькасныя, без выдзялення… якаснай своеасаблівасці ведаў» (В.В.Давыдаў).

*Республиканский постоянно действующий семинар для авторов учебников и учебных пособий, членов экспертного сообщества*

# Забеспячэнне пераемнасці падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»

***Валочка Ганна Міхайлаўна*,**
**галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Акадэміі адукацыі**

28 апреля 2026 года